ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 5 (800) ● Чацвер, 11 лютага 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

## ПА УНІВЕРСІТЭТ

● «XXIV з'езду КПСС— дастойную сустрэчу» — пад та
візам праходзіў прафсаюзна-гаспадарчы актыў універсітэт
кладам выступіў прарэктар БДУ па адміністрацыйна-гасп
частцы І. А. Ажыгін. Ён гаварыў аб тым, як работнікі гасп
часткі рыхтуюцца сустрэць знамянальную падзею, закрану
пытанняў ашчаднасці і беражлівасці, захавання сацыялі
уласнасці, адзначыў некаторыя недахопы і хібы, указаў на
масці іх хуткага ўхілення.

У спрэчках па дакладу выступілі старшыня мясцкома В. Ф. Чыгір, намеснік дэкана філалагічнага факультэта М. М. Піпчанка, электрык С. С. Сапронаў, камендант юрыдычнага корпуса В. М. Бурмакіна, намеснік дэкана хімфака В. Ф. Цікавы і іншыя. Яны вялі гутарку аб надзённых клопатах і праблемах, аб тым, як палепшыць і актывізаваць дзейнасць прафсаюзнай арганізацыі і гаспадарчай часткі, каб найбольш эфектыўна выканаць сацыялістычныя абавязацельствы і дастойна сустрэць XXIV з'езд КПСС і 50-годдзе універсітэта.

● Трэці год пад старшынствам рэктара акадэміка А. Н. Сеўчанкі ва універсітэце працуе аддзяленне таварыства савецка-балгарскай дружбы. На днях адбылося чарговае пасяджэнне праўлення, на якім са справаздачай аб рабоце за 1970 год выступіў намеснік старшыні праўлення дацэнт Д. Б. Мельцар.

Актыўны ўдзел у абмеркаванні даклада прынялі прафесар А. Я. Супрун, дацэнты Н. С. Гілевіч, В. М. Цімафеева, А. А. Галаўко, сакратар камітэта камсамола БДУ В. І. Пракошын, загадчык аддзела зарубежных сувязей С. С. Булычоў, дырэктар бібліятэкі І. У. Арэхоўская.

Намечана праграма работы аддзялення таварыства на 1971 год.

## ПЛАНЫ— У ЖЫЦЦЁ

Красамоўна сведчаць аб усенародным працоўным уздыме поспехі перадз'ездаўскага спаборніцтва на заводах і фабрыках, на калгасных і саўгасных палях, у лабараторыях і аўдыторыях навучальных устаноў.

Ва універсітэце праведзены нарады камсамольскага і прафсаюзнага актываў, прысвечаныя дастойнай падрыхтоўцы да з'езда. З кастрычніка мінулага года па плану камітэта камсамола арганізуюцца сустрэчы з ветэранамі Камуністычнай партыі. Першакурснікі ўсіх факультэтаў робяць экскурсіі ў Дом-музей І з'езда РСДРП, музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Намечаны экскурсіі на месцы партызанскага падполля часоў Вялікай Айчыннай вайны, выезды ў Хатынь і да Кургана Славы.

На ўсіх факультэтах ідзе спаборніцтва вучэбных груп за права называцца лепшымі.

У гэтым месяцы на факультэтах будуць аформлены фотастэнды «Партыя і камсамол» і фотавыстаўкі «Камсамол універсітэта — рэспубліцы». У перадз'ездаўскія дні пройдзе фестываль патрыятычнай песні, адбудзецца навуковая канферэнцыя па праблемах гісторыі КПСС, КПБ і міжнароднага маладзёжнага руху.

Вялікую работу праводзяць спартыўныя калектывы факультэтаў. У перыяд зімовых канікул 24 атрады зрабілі агітпаходы па Беларусі. Студэнты універсітэта пабывалі ў Брэсце, у Гродзенскай, Віцебскай і іншых абласцях рэспублікі, у Бярэзінскім запаведніку. Іх маршруты пралеглі праз населеныя пункты калгасаў і саўгасаў. Для сельскіх працаўнікоў і вучнёўскай моладзі прачытаны лекцыі, рабяты выступілі з канцэртамі мастацкай самадзейнасці.

Камсамольцы універсітэта паспяхова ажыццяўляюць намечаныя планы і рыхтуюць дастойную сустрэчу XXIV з'езду ленінскай партыі.

І. КАШАРОЎСКІ.

**18 лютага а 15-й гадзіне ў актавай зале адбудуцца заняткі кіруючых работнікаў, партыйнага, прафсаюзнага і камсамольскага актыву універсітэта. З лекцыяй на тэму «Службовая этыка» выступіць доктар юрыдычных навук прафесар А. В. Дулаў.**



На кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін многа ўвагі ўдзяляецца вывучэнню азёр Беларусі.

На здымку Г. Марозава вы бачыце малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі азёразнаўства П. І. Бурдыку за чарговымі даследаваннямі.

## ВЫНІКІ—ПА ПРАЦЫ

Небывалым працоўным і палітычным уздымам сустракаюць савецкія людзі XXIV з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. З усіх канцоў нашай вялікай Радзімы ідуць усё новыя і новыя весткі аб выдатных перамогах нашага народа ў будаўніцтве камунізма.

Калектыў факультэта журналістыкі, ідучы насустрач XXIV з'езду КПСС, XXVII з'езду КПБ і 50-годдзю універсітэта, узяў на сябе канкрэтныя сацыялістычныя абавязацельствы: значна палепшыць вучэбную, навуковую і палітыка-выхаваўчую работу, дабіцца новых поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных журналістаў —ідэйных байцоў партыі.

Узятыя абавязацельствы намі з поспехам выконваюцца. Аб гэтым красамоўна сведчаць вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі. Дастаткова сказаць, што з усіх студэнтаў факультэта, здаваўшых экзамены, толькі адзін чалавек атрымаў нездавальняючую ацэнку. 30 працэнтаў студэнтаў факультэта здалі сесію толькі на выдатна, 49—на выдатна і добра і каля 21—на здавальняюча.

Радуе і тое, што студэнты першага курса паспяхова вытрымалі выпрабаванне. Ім патрэбна было здаць два экзамены і 5 залікаў. Усе 80 студэнтаў з'явіліся на экзамены. З іх 12 атрымалі толькі выдатныя адзнакі, 33—выдатныя і добрыя і 35— добрыя і здавальняючыя.

Першае месца па выніках сесіі займаюць студэнты II курса. Усяго тут здавала сесію 85 чалавек. Здалі ўсе прадметы выдатна 12 чалавек, выдатна і добра—44, добра і здавальняюча — 28 чалавек. Другое месца займае III курс. Тут удзельнічала ў сесіі 62 студэнты. Здалі ўсе прадметы на выдатна—3; на выдатна і добра—33, 26 студэнтаў атрымалі добрыя і здавальняючыя адзнакі.

Радуюць поспехі студэнтаў па грамадскіх дысцыплінах. На першым курсе ўсе студэнты атрымалі залік па гісторыі КПСС, другакурснікі здавалі экзамен па гэтаму прадмету. З 84 чалавек здалі на выдатна 21, 46 — на добра, толькі 17—на здавальняюча. Студэнты III курса здавалі марксісцка-ленінскую філасофію. З 64 здаваўшых атрымалі выдатна 25 чалавек, добра—27, і веды 12-ці ацэнены здавальняючымі адзнакамі. На IV курсе студэнты трымалі экзамен па палітычнай эканоміі. З 79 здаваўшых выдатныя веды паказалі 15 чалавек, 40—добрыя, здавальняючыя—23 і нездавальняючыя—1.

Кожная сесія—гэта вынік напружанай работы ўсяго калектыву факультэта. Асабліва была яна напружанай у перадз'ездаўскі год. З першых жа дзён семестра дэканат, партыйнае бюро, кафедры, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі журфака звярнулі асаблівую ўвагу на наладжванне дысцыпліны, паляпшэнне вучэбнай і выхаваўчай работы сярод студэнтаў. Акрамя журналаў наведвання лекцый, на кожную групу быў заведзен асобны сшытак, у якім адзначалася наведванне кожным студэнтам групы лекцый, практычных заняткаў. Пры гэтым выкладчыкі распісваліся ў сшытках за правільнасць уліку. Тут жа выстаўляліся адзнакі за практычныя заняткі. Дэканат і кафедры выклікалі студэнтаў, якія нядбайна адносіліся да вучобы. Значна палепшылася кантроль за самастойнай работай студэнтаў.

Адразу пасля таго, як стала вядома аб тэрміне адкрыцця XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда КПБ, дэканатам, партбюро, кафедрамі, камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі былі выпрацаваны канкрэтныя абавязацельствы ў гонар з'езда і даведзены да кожнага выкладчыка, кожнага студэнта. Быў наладжан строгі кантроль за выкананнем гэтых абавязацельстваў. Гэтаму пытанню былі прысвечаны партыйны сход, вучоны савет факультэта, камсамольскі сход. На сходах і вучоным савеце абмяркоўваліся вынікі праверак выканання сацыялістычных абавязацельстваў, крытыкаваліся студэнты і выкладчыкі, якія не ўсё яшчэ рабілі для ажыццяўлення сацыялістычных абавязацельстваў.

Мы дабіліся значнага паляпшэння насценнага друку. На старонках газет курсавых, а таксама факультэцкай паўней стала адлюстроўвацца жыццё факультэта. Рэзкай крытыцы падвяргаліся тыя студэнты, якія парушалі дысцыпліну, рабілі амаральныя ўчынкі. Усё гэта дало плённыя вынікі. Мы ганарымся такімі студэнтамі, як М. Толсцік, В. Шмырына, І. Асінскі, В. Гурын, У. Трусаў, І. Гарніна, М. Дым.

Задача дэканата, кафедр, партыйнай і камсамольскай арганізацый —замацаваць дасягнутыя поспехі і яшчэ вышэй узняць узровень усёй вучэбнай, навуковай і палітыка-выхаваўчай работы.

Р. БУЛАЦКІ,
дэкан факультэта журналістыкі, дацэнт.

**На здымку:** першую лекцыю ў другім семестры па гісторыі мастацтваў чытае для студэнтаў чацвёртага курса факультэта журналістыкі Уладзімір Андрэевіч **Бойка**.

Фота Д. Чаховіча.



# ПАД БЕЛАРУСКІЯ МЕЛОДЫІ

Танцавальны калектыў БДУ «Крыжачок» не толькі ў Мінску здабыў папулярнасць, але і ў рэспубліцы, і за яе межамі. «Крыжачок» быў і за рубяжом.

З некалькімі пытаннямі я звярнуўся да кіраўніка ансамбля Мікалая Вікенцьевіча Лапшы.

**— Раскажыце, калі ласка, аб цяперашнім «Крыжачку».**

— У саставе калектыву зараз 60 рабят. Гэта ў асноўным студэнты розных факультэтаў. Але ёсць і ветэраны, якія ўжо скончылі універсітэт, аспіранты.

Трэба адзначыць, што танцуюць рабяты з захапленнем. Кожны мае свой мастацкі почырк.

**— У якіх паездках пабываў калектыў?**

— Іх за час існавання ансамбля было вельмі многа. Мы пабывалі ў малых і ў вялікіх гарадах. Выступалі перад жыхарамі Казані, Калінінграда, Харкава, Вільнюса, Ленінграда. Пабываў «Крыжачок» у ГДР. Гэтыя паездкі, як правіла, прыносілі нам поспех і падзякі гледачоў.

З многімі ансамблямі гэтых гарадоў нас звязвае творчая дружба. Ды і не толькі гэтых. Мы вельмі сябруем з польскім народным ансамблем «Шлёнск». Некаторыя танцы нашага рэпертуару пастаўлены польскімі балетмайстрамі.

**— Дарэчы, некалькі слоў аб рэпертуары.**

— Вядома, расказаць аб усім рэпертуары падрабязна немагчыма. За дваццаць год ён уключыў у сябе мноства танцаў. У асноўным гэта беларускія народныя танцы, танцы народаў Савецкага Саюза, а таксама краін народнай дэмакратыі. Наогул мы прытрымліваліся погляду, што нішто так глыбока не можа адлюстраваць звычаі, настрой, пачуцці, як народныя танцы. Ды і сама назва нашага калектыву абавязвае нас любіць і шанаваць народнае мастацтва.

**— Мікалай Вікенцьевіч, вы гаварылі, што ў ансамблі ёсць і ветэраны, вядучыя артысты. Раскажыце, калі ласка, пра іх.**

— У нашым «Крыжачку» ёсць сапраўдныя энтузіясты. Гэта Ядзя Яловічава, Валодзя Дудко, Люда Грышчанка, Галя Цалавальнікава. Але аб сабе лепш яны раскажуць самі.

**Я. Яловічава:** У ансамблі я ўжо 14 год. Гэта, пэўна, нямала. Пабывала ва ўсіх яго паездках, прымала ўдзел амаль ва ўсіх выступленнях. Нягледзячы на свае сямейныя клопаты не збіраюся пакідаць «Крыжачок». Калі мяне пытаюць, што даюць заняткі танцамі, я звычайна адказваю: вельмі многае. Акрамя эстэтычнага задавальнення, яны прыносяць і радасць поспеху, а таксама шчырае сяброўства. Наш «Крыжачок» — гэта калектыў у поўным сэнсе слова.

**У. Дудко:** Калі пачаў танцаваць, дакладна не памятаю: пэўна, з дашкольнага ўзросту. У ансамблі таксама даўно. Для мяне заняткі танцамі — гэта зарадка бадзёрасці, магчымасць непасрэдна далучыцца да мастацтва, лепш зразумець яго. Танцы дапамагаюць захаваць прыгожую постаць, што для юнака таксама важна, як і для дзяўчыны. Акрамя таго, выхоўваюць сапраўды рыцарскія адносіны да дзяўчыны. І мне хочацца параіць юнакам: «Ідзіце ў наш калектыў. Аб гэтым вы не будзеце шкадаваць».

— Некалькі слоў хацелася б сказаць пра нашага кіраўніка Мікалая Вікенцьевіча Лапшу. Гэта вельмі чулы, улюбёны ў мастацтва чалавек. Многімі сваімі поспехамі «Крыжачок» абавязан яму, яго вытрымцы, уменню раскрыць у пастаноўцы душу танца.

З прыходам Мікалая Вікенцьевіча ансамбль атрымаў званне народнага і стаў лаўрэатам гарадскога агляду танцавальных калектываў. «Крыжачок» узнагароджаны многімі дыпломамі і граматамі.

Пачалася рэпетыцыя. Як таямнічы чараўнік, Мікалай Вікенцьевіч ускідае рукі, кіруючы танцам. Льецца беларуская мелодыя, то спакойная, а то раптам буйная і імклівая, як віхор. Вось яна закружыла ў танцы пары, павяла іх. І свет перафарбаваўся ў якісьці цудоўны колер.

Гутарку правёў студэнт **В. КУБЕКА.**

# ЯК Я ЖАНІЎСЯ

*ГУМАРЭСКА*

Мы ПАКАХАЛІ адзін аднаго з першага погляду. З першага таму, што была вясна, што нам абодвум страшна не хапала часу.

Я сказаў, што мяне завуць Лёня.

Яна сказала, што яе завуць Лена.

Дамовіўшыся аб наступнай сустрэчы, мы развіталіся. Яе забраў тралейбус, мяне прыдавілі дзверцы адыходзячага аўтобуса.

Першае наша спатканне цягнулася цэлых 24 мінуты. З-за гэтага яна на тры практыкаванні скараціла трэніроўку па сістэме іёгаў, а я на восем мінут спазніўся на рэпетыцыю хору.

Такія ахвяры прыносяць толькі тыя, хто кахае пасапраўднаму.

У наступны раз мы сустрэліся ўжо ў ЗАГСе. Заручальныя пярсцёнкі надзелі яшчэ раней, кожны сам сабе, сэканоміўшы такім чынам некалькі каштоўных мінут.

Пакуль ішла шлюбная цырымонія, каб не траціць марна часу, я сплятаў у думках перадавы артыкул для насценгазеты. Яна ўпаўголаса нашэптвала ўрок, зададзены на курсах нарвежскай мовы.

Сябры і блізкія нас не віншавалі: па-першае, яны абяцалі зрабіць гэта калі-небудзь у вольны час, а па-другое, падалі шампанскае. Пробкі выскачылі так дружна, нібы хто даў кароткую чаргу з кулямёта.

— Пара, — сказала мая жонка, адставіўшы недапіты бакал. — У мяне сёння палітзаняткі.

Я паглядзеў на гадзіннік і стаў праціскацца праз рады запрошаных: мне неабходна было паспець на пасяджэнне кінааматараў.

У дзвярах мая жонка спынілася, дастала з сумачкі невялікую фотакартачку і працягнула мне: «Вось... Вазьмі на памяць. Хто ведае, калі яшчэ ўбачымся...»

— Ну, мне налева, — сказала яна, калі мы выбеглі на вуліцу. — Да сустрэчы...

У адказ я моўчкі кіўнуў галавой, дажоўваючы на хаду бутэрброд з чорнай ікрой, і павярнуў направа.

Назаўтра ў самым канцы працоўнага дня я заўважыў жонку ў нашым канструктарскім бюро. Яна стаяла за суседнім кульманам і нешта чарціла.

— Прывітанне,—сказаў я, заточваючы аловак.

— А, гэта ты, — сказала яна, адкрываючы новую баначку тушы. — Што, наведаць забег?

— Наведаць? — здзівіўся я, прымацоўваючы кальку да ліста ватманскай паперы. —Ды я тут працую. А вось ты што робіш?

— Я таксама. Тры гады ўжо, — адказала яна, запраўляючы рэйсфедэр тушшу.

— А я чацвёрты, — сказаў я.

— Чацвёрты — што? Дзень? — пацікавілася яна, праводзячы паралельныя прамыя.

— Не, год, — растлумачыў я, вычэрчваючы парабалічную крывую.

— Мы замоўклі, захопленыя кожны сваёй справай.

— Гэта добра, што мы працуем разам, — праз некаторы час сказаў я, вычэрчваючы эліпс. — Часцей бачыцца будзем.

— Нам проста пашанцавала, — згадзілася яна, праводзячы цыркулем канцэнтрычныя акружнасці. — Ты чым займаешся сёння вечарам?

— Усяго толькі гурток мастацкай самадзейнасці і трэніроўка па фехтаванню, — заўважыў я, праводзячы апошнюю штрыхпунктырную лінію. — А ў цябе што?

— Так, дробязь, — махнула яна рукой, выкідваючы ў карзіну апусцеўшую баначку. — Збегаю ў ізастудыю і пасяджу на лекцыі.

— Выдатна, — абрадавана сказаў я, любуючыся выкананай работай. — Значыць, мы паспеем схадзіць у кіно.

— Што ж, нядрэнна, — задаволена кіўнула яна, сколваючы гатовы чарцёж.— На які сеанс?

Але на гэтае пытанне адказаць я ўжо не паспеў, таму што рабочы дзень закончыўся і мне трэба было бегчы.

**Ул. ЛОГІНАЎ,**
**студэнт аддзялення палітэканоміі.**

# ПСІХАЛАГІЧНЫ ПРАКТЫКУМ

● *На дзяжурства не прыйшоў ніхто. На суботнік выйшла чацвёртая частка групы. На сход з'явілася палова з тых, хто мае вымову за непаспяховасць. Грамадскай работай займаецца столькі ж, колькі выйшла на дзяжурства.*

*Пытанне: колькі ў групе чалавек, калі заявы на стыпендыю падалі ўсе?*

● *Кожны рыхтуецца да экзамена па-свойму: Пеця вывучыў сёе-тое; Таня вучыла сяк-так; Оля сёе-тое вучыла сяктак; Валодзя ведаў, як завуць выкладчыка; Валера не ведаў нічога.*

*Пытанне: чый метад падрыхтоўкі найбольш прагрэсіўны, калі разам яны набралі на экзамене 10 балаў?*

# РЭПЛІКІ ВЯДОМЫХ ЛЮДЗЕЙ

**НЕ ПАШАНЦАВАЛА.**

Калі Бернард Шоу быў ужо вядомым пісьменнікам, ён неяк на шашы сутыкнуўся з веласіпедыстам. На шчасце, усё абышлося добра. Веласіпедыст пачаў прасіць прабачэння, але Шоу папярэдзіў:

— Вам не пашанцавала, сэр. Яшчэ крыху энергіі, і вы заслужылі б бяссмерце як мой забойца.

**ЦІ МОЖНА ІНАКШ!**

Адзін з сяброў вядомага італьянскага кампазітара Джакіна Расіні паведаміў яму, што яго родны горад хоча пажыццёва ўзвесці яму манумент.

— Колькі павінен каштаваць манумент? — спытаў той.

— Дваццаць тысяч лір.

— Так многа грошай... — уздыхнуў Расіні. — За палову гэтай сумы я гатоў сам стаць на пастамент.

**САМААЦЭНКА.**

Калі аднойчы Аляксандр Дзюма-бацька вярнуўся са святочнага абеду дадому, яго сын спытаў:

— Ну як, было весела, цікава?

— Вельмі, — адказаў Дзюма. — Калі б не было там мяне, я б памёр ад суму.

**ДЭБЮТ КАМПАЗІТАРА.**

Першы канцэрт вядомага нямецкага кампазітара Фрыдрыха Гендэля ў Лондане не меў поспеху. Гэта вельмі ўсхвалявала сяброў кампазітара. Але сам Гендэль быў спакойны.

— Не засмучайцеся,—суцешыў ён іх,—у пустой зале музыка гучыць лепш.







Удачны кадр — вялікая радасць для фотааматара. Сёння мы прапануем нашым чытачам некалькі здымкаў **Д. Чаховіча.**

● Раніца сяброў.

● Першая прагулка —першыя здзіўленні.

● На руцэ, як на галінцы.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.